# Душы цудоўныя імкненні

## Партрэт творцы



**ТАІРАВА Ларыса Сяргееўна** – дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства

Беларуская зямля багата талентамі. Трэба толькі своечасова іх заўважыць, ацаніць, аддаць ім даніну павагі і захаплення. Гэта садзейнічае захаванню таленту, спрыяе яго развіццю. На жаль, прызнанне часам прыходзіць да творцаў вельмі позна, іншы раз нават праз замежных слухачоў і гледачоў. Трэба, каб такое здаралася як мага радзей, каб нашы таленты заставаліся з намі і працавалі на карысць айчыннай культуры. На гэты раз гаворка пойдзе пра беларускага баяніста, кампазітара, заслужанага артыста Беларусі ***Уладзіміра Ткача.*** Гэта імя пакуль што вядома толькі вузкаму колу прафесіяналаў і аматараў пераважна народна-інструментальнага жанру. У рэестры кампазітараў яго таксама не знойдзеш, але...

Развіццё народна-інструментальнага мастацтва цяжка ўявіць без дамрыста А. Цыганкова, баяніста В. Грыдзіна і інш. На жаль, В. Грыдзін рана пайшоў з жыцця. Тым не менш ён паспеў пакінуць шмат выдатных твораў для баяна: «Гарэзлівыя найгрышы», «Рассыпуха», «Цыганская рапсодыя», «Амурскія хвалі» і інш. Гэту традыцыю ў баянным мастацтве, распачатую расійскім баяністам і кампазітарам, з поспехам працягвае У. Ткач — «наш беларускі Віктар Грыдзін», як яго называюць сябры і калегі.

Пасля заканчэння Беларускай акадэміі музыкі па класе баяна ў прафесара В. А. Чабана ён быў накіраваны ў Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя І. Жыновіча ў якасці баяніста-рэгулятара. Праца ў прафесійным калектыве пад кіраўніцтвам М. Казінца, побач з такімі вопытнымі музыкантамі-салістамі, як народная артыстка Рэспублікі Беларусь С. Лясун, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Л. Рыдлеўская, спрыяла станаўленню Уладзіміра як творчай асобы са сваім арыгінальным поглядам на музычнае мастацтва. Па сутнасці, ён трапіў адразу ў два калектывы: будучы артыстам аркестра, У. Ткач адначасова стаў удзельнікам трыо баяністаў (разам са С. Лясун і В. Пляшэвічам).

Узнікненне трыо баяністаў у межах аркестравага калектыву — сведчанне творчага і зацікаўленага стаўлення да кожнага яго ўдзельніка з боку кіраўніцтва аркестра. Пры наяўнасці таленту і жадання музыканты калектыву маюць магчымасць цалкам рэалізавацца ў якасці салістаў-выканаўцаў, кампазітараў ці ва ўсіх іпастасях адначасова, што і робяць многія з іх, ствараючы айчынную музычную культуру. Бадай, ніводны канцэрт аркестра не абыходзіцца без удзелу трыо баяністаў. Іх яркая, віртуозная, артыстычная ігра — сапраўднае ўпрыгожванне любога

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



мерапрыемства. Яны заўсёды знаходзяцца ў пошуку новых сучасных музычных ідэй. Магчыма, пастаянная праца над сабой і імкненне знайсці арыгінальныя рэпертуарныя крыніцы прывялі У. Ткача да стварэння асабістых твораў. Першы з іх быў напісаны на тэму вядомай народнай песні «Выйду на вуліцу» для трыо баянаў з ударнымі пад уплывам апрацоўкі Я. Дзярбенкі на аналагічную тэму. Потым па «спецыяльным заказе» С. Лясун У. Ткач стварыў вытанчаную «Карэла-фінскую польку». Першыя вопыты большасці кампазітараў носяць адбітак творчасці тых, на каго творцы хочуць быць падобнымі, — сваіх куміраў па рамястве. І ў гэтым сэнсе У. Ткач не з'яўляецца выключэннем. Пад непасрэдным уплывам дзейнасці А. Цыганкова і як даніна павагі яму з'явілася чароўная «Падэспань».

Першапачатковы музычны матэрыял дазволіў выявіць своеасаблівы творчы почырк У. Ткача, а таксама яго выдатны густ. Як правіла, у аснову сваіх твораў ён кладзе не сучасныя, а добра вядомыя і крыху забытыя мелодыі, якія, як дарагое віно, вытрыманае часам, выверaны слухацкай прыхільнасцю не аднаго пакалення знатакоў сапраўднай прыгажосці. «Рыо-рыта», «Besame mucho», «Кумпарсіта», «Успамін» на тэму песні Я. Розенфельда «Люблю» — вось далёка не поўны пералік кампазітарскіх інтарэсаў У. Ткача.

На першы погляд можа падацца, што аснова яго твораў даволі банальная. Іх часта называюць апрацоўкамі, маўляў, першапачатковая ідэя належыць іншым аўтарам. Гэта так, але тое, што з імі робіць кампазітар, не паддаецца апісанню. Калі банальная апрацоўка істотна не змяняе той ці іншы твор, то глыбокае кампазітарскае пранікненне ў сутнасць асноўнай тэмы (тое, што мы называем мерай аўтарскай датыкальнасці, аўтарскага умяшання) ператварае яго ў транскрыпцыю. Таму так званыя апрацоўкі У. Ткача можна смела аднесці да гэтага жанру.

Характэрнай рысай яго кампазітарскага мыслення з'яўляецца неверагодная гукавая спрэсаванасць, дасягнутая багатай, насычанай фактурай, дзе практычна адсутнічае свабодная ад гукавога россыпу прастора. Надзвычай яркая тэма упрыгожана мнагаслойнай меладычнай вяззю, а таксама складанымі і чароўнымі гукавымі пасажамі. І так у кожным творы. Багатая, нястрымная фантазія кампазітара стварае пэўныя цяжкасці для выканаўцаў.

З цягам часу кампазітарскія ідэі пераўзышлі магчымасці трыо, і ў творчым багажы У. Ткача з'явіліся першыя творы для аркестра: Серэнада, калаж на тэму народнай песні «Залатыя горы», уверцюра «Святочны рэверанс», Вальс-мазурка, Рапсодыя на тэму мелодыі «Вочы чорныя» для баяна з аркестрам. Усе яны, акрамя Рапсодыі, — новы пласт у творчасці кампазітара, яго асабістая музыка, у аснове якой не папулярная тэма, а плод натхнення і фантазіі. Самае прыемнае тое, што гэтыя творы У. Ткача па прыгажосці зыходнага матэрыялу і па метадах апрацоўкі ні ў чым не саступаюць яго транскрыпцыям.

Актыўная выканальніцкая дзейнасць У. Ткача прывяла яго да стварэння выдатных па меладызме твораў для баяна: «Натхненне», «Вальс-жарт», факстрот «Брыльянт». Кожны з іх, як і ўсё, што напісана кампазітарам, адразу становіцца рэпертуарнай жамчужынай народна-інструментальных калектываў і салістаў. Музыка У. Ткача — сапраўднае упрыгожванне любога канцэрта з яго удзелам, і справа тут не толькі ў выдатным музычным матэрыяле. Прыкметнымі выканальніцкімі рысамі У. Ткача з'яўляюцца артыстызм і неверагодная вынаходлівасць. Кожны твор — гэта міні-спектакль, дасканала пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

думаны і адрэжысіраваны, відавочны і яркі, асабліва калі на сцэне кампазітар, выканаўца і артыст у адной асобе. Найбольш паказальная ў гэтым плане п'еса «Музычныя камедыянты» — міні-спектакль для сола-баяна і флейты з аркестрам (спаборніцтва віртуозаў на фоне аркестра). Гэта трэба не толькі чуць, але і бачыць!

У залежнасці ад абставін трыо можа з лёгкасцю ператварацца ў дуэт ці ансамбль з большай колькасцю ўдзельнікаў. Некаторыя творы У. Ткача ўвогуле напісаны для трыо з ударнымі інструментамі («Выйду на вуліцу», «Besame mucho» і інш.). У такіх выпадках да трыо далучаецца саліст аркестра А. Хрыпаў (ударныя інструменты) — музыкант адметнага густу і артыстызму, што надае гучанню кампазіцый непаўторны каларыт. Двойчы (у 1992 і 1993 гг.) трыо ў пашыраным саставе з поспехам гастралявала ў Фінляндыі, радавала слухачоў Швецыі, Германіі, Турцыі. У 2002 г. дуэт у складзе С. Лясун і У. Ткача стаў прызёрам Залатога кубка Міжнароднага фестывалю «Пхеньянская вясна» ў Паўночнай Карэі, дзе яны прадставілі арыгінальны твор кампазітара «Полька-жарт», які быў пасля адзначаны спецыяльным дыпломам пад назвай «Баян-полька».

Ва ўсе часы ў кампазітарскім асяроддзі існавала своеасаблівая праслойка так званых кампазітараў-выканаўцаў, творчасць якіх адрозніваецца унікальным спалучэннем выканальніцкага і кампазітарскага майстэрства. Менавіта яны аказваюць рашучае ўздзеянне на развіццё асобных відаў музычна-інструментальнага мастацтва. Дастаткова ўзгадаць вялікага Ніколу Паганіні, які ў свой час узнёс скрыпічнае мастацтва на недасягальную вышыню.

У кожнага кампазітара асабісты творчы шлях. У адных кампазітарскі талент праяўляецца ў раннім дзяцінстве або юнацтве. Другім патрэбны нейкі час, каб назапасіць жыццёвы, выканальніцкі і кампазітарскі вопыт. Так, напрыклад, вядомы беларускі кампазітар Г. Ермачэнкаў заявіў аб сабе як творца, будучы сталым музыкантам і выкладчыкам на пасадзе дацэнта акадэміі музыкі. Многія выканаўцы пачынаюць складаць асабістую музыку з-за вострай неабходнасці ў абнаўленні свайго рэпертуару. Гэта такія самадзейныя кампазітары, як В. Малых з г. Наваполацка, В. Глубачэнка — дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, А. Крамко — саліст Нацыянальнага аркестра імя І. Жыновіча і інш. У гэтым сэнсе У. Ткач не з'яўляецца выключэннем. Наогул у Нацыянальным аркестры зараз вельмі выразна вылучаюцца дзве рэпертуарныя галіны: фальклорная, у якой плённа працуе А. Крамко, і эстрадна-акадэмічная, распачатая У. Ткачом.

У апошнія некалькі гадоў Уладзімір Міхайлавіч паспяхова сумяшчае сваю асноўную работу ў аркестры з педагагічнай працай у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Назапашаны выканальніцкі і кампазітарскі вопыт У. Ткач перадае сваім вучням. Разам з імі выходзіць на сцэну, выступае як саліст з самымі рознымі па складзе вучэбнымі аркестрамі, выконваючы свае цудоўныя творы. І самае галоўнае — стварае арыгінальны рэпертуар, які шырока выкарыстоўваецца ў навучальным працэсе.

У. Ткач знаходзіцца ў стане творчага росквіту, калі ёсць амаль усё, што патрэбна для плённай дзейнасці: выдатная адукацыя, сталы ўзрост (крышачку за пяцьдзесят), выканальніцкае і педагагічнае майстэрства, кампазітарскі талент. Нам застаецца пажадаць, каб душы цудоўныя імкненні як мага часцей знаходзілі сваё ўвасабленне ў новых творчых здзяйсненнях музыканта.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ